Источник: **«Звязда» - 2013-01-09**

# ВАНЬКОВІЧЫ

## Ваньковічы — старажытны шляхецкі беларускі род

Ваньковічы — старажытны шляхецкі беларускі род герба "Ліс". Свой пачатак род Ваньковічаў бярэ ў глыбокай даўніне. Першае ўпамінаннне пра род адносіцца да 1499 года. Прадстаўнікі роду займалі розныя пасады ў адміністрацыі Вялікага Княства Літоўскага і Расійскай імперыі: падкаморы віленскі (Пётр Ваньковіч), *харужы мінскі* (Ян Ваньковіч), *падчашы аршанскі*(Станіслаў Ваньковіч), *суддзя земскі мінскі* (Уладзіслаў Ваньковіч), *кашталян мінскі* (Тэадор Антоні Ваньковіч), *староста краснасельскі, дэпутат Галоўнага Літоўскага трыбунала* (Адам Ваньковіч), *суддзя земскі мінскі* (Уладзіслаў Ваньковіч); *стольнік і падстароста судовы мінскі, кашталян мінскі* (Тэадор Антоні Ваньковіч); *мечнік мінскі* (Тадэвуш Ваньковіч), *пісар гродскі мінскі*(Юзаф Ваньковіч), *чашнік мінскі* (Тамаш Ваньковіч). Многія з Ваньковічаў абіраліся дэпутатамі вышэйшага апеляцыйнага суда ў Вялікім Княстве Літоўскім — Галоўнага трыбунала (Адам, Уладзіслаў, Тэадор Антоні, Уладзіслаў Тадэвуш Ваньковічы). У часы Расійскай імперыі некаторыя з прадстаўнікоў славутага роду Ваньковічаў з'яўляліся павятовымі прадвадзіцелямі дваранства: *Юзаф, Апалінары, Леў Апалінаравіч Ваньковічы* (прадвадзіцелі дваранства Мінскага павета), *Станіслаў Ваньковіч* (прадвадзіцель дваранства Барысаўскага павета),*Антон Ваньковіч* (прадвадзіцель дваранства Ігуменскага павета). Прадстаўнікі знакамітага роду ніколі не заставаліся ў баку ад грамадска-палітычных падзей, што адбываліся на іх радзіме. Так, Ян Эдвард Валенцьевіч Ваньковіч з'яўляўся ўдзельнікам паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага: змагаўся на тэрыторыі Падляшша, узначальваў Брэсцкі паўстанцкі атрад. Былі сярод прадстаўнікоў роду асобы, якія пакінулі значны след у славянскім літаратуразнаўстве: Мельхіёр Ваньковіч (1891 — 1974), ураджэнец Ігуменскага павета, (цяпер Бярэзінскага раёна), у энцыклапедычных даведніках значыцца як польскі празаік і публіцыст. Нягледзячы на тое, што Мельхіёр Ваньковіч доўгі час жыў у ЗША і Польшчы, у сваіх мастацкіх і публіцыстычных творах ён апісваў родныя беларускія мясціны. Жывучы ў Варшаве, ён шмат апекаваўся маладымі пісьменнікамі, ураджэнцамі з Беларусі.

## Валенцій Ваньковіч — знакавая фігура  Валенцій Ваньковіч ў беларускай культуры

Самым знакамітым прадстаўніком роду Ваньковічаў з'яўляецца Валенцій Мельхіёравіч Ваньковіч. Нарадзіўся Валенцій Ваньковіч у вёсцы Калюжыца Ігуменскага павета (сучасны Бярэзінскі раён Мінскай вобласці). Дзяцінства прайшло ў вёсцы Сляпянка пад Мінскам, вучыўся ў Полацкім езуіцкім калегіуме. Вучыўся на аддзяленні літаратуры і прыгожых мастацтваў Віленскага ўніверсітэта, скончыў вучобу ў Пецярбургскай імператарскай акадэміі мастацтваў. У 1829 годзе, атрымаўшы акадэмічную адукацыю і вядомасць, Валенцій вярнуўся на Міншчыну ў свой радавы маёнтак Сляпянка. У 1839 годзе адважыўся на паездку ў Еўропу, дзе знаходзіліся цэнтры класічнага і перадавога мастацтва таго часу. Аднак гэтая вандроўка стала апошняй: пражыўшы два гады ў Германіі (Мюнхен, Дрэздэн, Берлін), Валенцій Ваньковіч прыбыў у канцы 1841 года ў Парыж да свайго сябра Адама Міцкевіча. У хуткім часе мастак захварэў на сухоты і праз паўгода, 12 мая 1842 года, памёр на руках у Адама Міцкевіча, які запісаў яго завяшчанне: частку сваіх карцін мастак перадаў сваёй сям'і і сябрам юнацтва — А. Міцкевічу і А. Тавянскаму, астатнія былі прададзены з аўкцыёну за пазыкі. Пахаваны вядомы мастак быў на могілках Манмартр-дэ-Сен-Дэні ў Парыжы.

Ігар Капылоў. Ваньковічы

**Спадчына і нашчадкі Валенція Ваньковіча**

Валенцій Ваньковіч з'яўляецца аўтарам шматлікіх карцін: партрэты Аляксандра Пушкіна (1826 — 1827 гады), партрэты паэта Антонія Гарэцкага, піяністкі Марыі Шыманоўскай, музыканта Караля Ліпінскага і іншыя. Таксама сярод яго работ ёсць літаграфіі "Галава старога", "Аўтапартрэт" і малюнкі "Від руін у Італіі", "Пейзаж", "Сажалка" і іншыя. Калі Напалеон уступіў на тэрыторыю Беларусі, сям'я Ваньковічаў знаходзілася ў Мінску. Дванаццацігадовы Валенцій бачыў, якую вялікую падтрымку атрымаў французскі імператар з боку прадстаўнікоў вышэйшых саслоўяў грамадства, паколькі абяцаў аднавіць ВКЛ. Уражанні дзяцінства не пакідалі мастака ўсё жыццё, увесь час яго суправаджаў дух Напалеона. Відаць, з гэтай прычыны свайму куміру Валенцій Ваньковіч прысвяціў цэлую серыю палотнаў, у тым ліку "Напалеон каля вогнішча", "Напалеон над картай Еўропы", "Апафеоз Напалеона", "Напалеон на востраве Святой Алены".




Да ліку найлепшых твораў мастака належыць кампазіцыйны партрэт "Міцкевіч на скале Аю-Даг", напісаны ў 1828 годзе (твор захоўваецца ў Народным музеі ў Варшаве).

Творы мастака захоўваюцца ў зборах Вільні, Пецярбурга, Варшавы, Кракава. Многія работы знаходзяцца і ў прыватных калекцыях нашчадкаў тых, каго мастак пісаў у першай палове XIX ст. Апошняя карціна Ваньковіча "Маці Божая Вастрабрамская" захоўваецца ў парыжскім касцёле Сен-Северын.

У цэнтры беларускай сталіцы, яе гістарычнай частцы, адкрыты дом-музей Ваньковічаў, які з'яўляецца помнікам палацава-паркавай архітэктуры эпохі класіцызму.

У Валенція Ваньковіча былі тры сыны, якія атрымалі выдатную па тых часах ваенную адукацыю. Старэйшы Адам стаў паручнікам інжынерных войскаў. Малодшы сын Ян пасля заканчэння Пецярбургскагаляснога інстытута таксама даслужыўся да чына паручніка і працаваў у Белавежскай пушчы. Сярэдні сын Казімір выхоўваўся ў адным з лепшых ваенных кадэцкіх карпусоў сярэдзіны XIX стагоддзя — Аляксандраўскім, які знаходзіўся ў Брэсце. Усе тры сыны прынялі ўдзел у паўстанні 1863—1864 гг. пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага.

Прадстаўнікі роду Ваньковічаў лічыліся аднымі з самых заможных людзей Беларусі. Ваньковічам належалі маёнткі ў Навагрудскім і Ігуменскім паветах і на Вілейшчыне. Значная частка Мінска таксама належала Ваньковічам. Так, у экспазіцыі Дома-музея Ваньковічаў прадстаўлены дакумент, паводле якога да родавага маёнтка Ваньковічаў адносіліся паселішчы Вялікая Сляпянка, Камароўка, Сціклеў, Маляўшчыны, Навіны, Зялёны Луг. Многія з гэтых назваў добра вядомы і сёння жыхарам беларускай сталіцы. Акрамя таго, частка Камароўскага лесу з рэдкімі раслінамі, якая таксама была ўласнасцю Ваньковічаў, увайшла ў склад Батанічнага сада.

Нашчадкі прадстаўнікоў знакамітага шляхецкага роду ў наш час жывуць у Польшчы і іншых заходнееўрапейскіх краінах.

**Паходжанне прозвішча**

Мужчынскае хрысціянскія імёны Іаан (праваслаўнае) Ян (каталіцкае) былі самымі папулярнымі ў XVI стагоддзі на землях Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Гэтыя імёны ў народным асяроддзі ўтварылі вялікую колькасць варыянтаў: *Іван, Іванка, Іванец, Іванчык, Іванейчык, Іванека, Іванько, Іванюта, Іванюша, Іванюк, Іванчук, Іванік, Івах, Іваш, Івашка, Івашэнь, Ваня, Ванец, Ванюк, Ванчук, Вашко, Вашкель, Вашук, Янко, Янчук, Янук, Янучок, Януль, Янус, Янута, Януш, Янушка, Янушко, Янец, Янчык, Ясюк і іншыя.* Сярод гэтых народна-размоўных формаў сустракаецца таксама варыянт Ванько. Імя *Ванько* меў пачынальнік славутага роду Ваньковічаў. Пазней гэтае імя паслужыла асновай для ўтварэння прозвішча *Ваньковіч*.

Прозвішча *Ваньковіч* (і яго варыянты *Ванкевіч, Ванцовіч, Ванько, Ванькоў, Ваньшын*) сустракаецца ў многіх рэгіёнах Беларусі, але найбольш часта яно адзначаецца ў Мазырскім раёне Гомельскай вобласці, Бялыніцкім, Клімавіцкім, Магілёўскім раёнах Магілёўскай вобласці, Валожынскім, Лагойскім, Салігорскім, Стаўбцоўскім раёнах Мінскай вобласці і горадзе Мінску.

Нягледзячы на шырокую распаўсюджанасць прозвішчаў і імёнаў з асновай *Ванько*, населеных пунктаў з такой асновай на тэрыторыі сучаснай Беларусі амаль не засталося, за выключэннем вёскі Ванькоўшчына ў Пухавіцкім раёне і аднайменнай вёскі ў Слуцкім раёне Мінскай вобласці.

**Ігар КАПЫЛОЎ.**